«ГОД КНІГІ»

# Прыдняпроўя звонкія галасы

Аб гэтым выданні пісьменнікі, чытачы нашага Прыдняпроўскага краю ведалі яшчэ ў сярэдзіне мінулага года. На сайце Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна была размешчана інфармацыя аб тым, што падрыхтаваны да друку чарговы выпуск абласнога альманаха, які выходзіць у апошнія гады перыядычна, пад адной рубрыкай "Магілёўшчына літаратурная". У выданні змяшчаюцца пераважна новыя творы паэтаў, празаікаў, публіцыстаў, і чытачы, такім чынам, маюць добрыя магчымасці сустрэцца з аўтарамі, творчасцю якіх цікавяцца ўжо не першы год, а таксама адкрыць для сябе пачаткоўцаў прыгожага пісьменства.

Нядаўна ўсім нам прадстаўлена добрая магчымасць папоўніць свае бібліятэкі менавіта такім выданнем. У Магілёўскай абласной друкарні імя Спірыдона Собаля напрыканцы 2011 года выйшаў у свет альманах з творамі мясцовых паэтаў, празаікаў і публіцыстаў "Прыдняпроўе".

Што ж цікавага знойдзе для сябе ў гэтым выданні наш дапытлівы чытач, творы якіх аўтараў зацікавяць яго больш за ўсё?

У кнізе змешчаны паэтычныя, празаічныя, публіцыстычныя творы ўжо добра вядомых нашаму чытачу членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі Ніны Кавалёвай, Сяргея Кісялёва, Міхаіла Уласенкі з горада Горкі, магіляўчан Віктара Кунцэвіча, Яўгенія Соцікава, Віктара Арцем'ева, Уладзіслава Кавалёва, Алеся Казекі, Яўгена Булавы, а таксама Міколы Салаўцова з Чавус, Віталя Савіцкага з Кіраўскага раёна, Аляксея Кажамякі з Клімавіцкага раёна, Міколы Падабеда з гарадскога пасёлка Бялынічы, Аляксандра Балдоўскага з Крычава. Добра ў кнізе-альманаху прадстаўлены жанры апавядання, верша, пародыі, гумарэскі. Яўген Соцікаў прадстаўлены ўрыўкам "Вясна 1953 года" з аўтабіяграфічнай аповесці "Лёс". Вялікую чытацкую цікавасць выклікае таксама і ўрывак з кнігі Аляксея Кажамякі "Яны стваралі ракетна-касмічную тэхніку" пра нашых знакамітых землякоў, ураджэнцаў Магілёўшчыны. Змешчаны ў альманаху і некалькі нарысаў з кнігі Віктара Арцем'ева "Урокі Аляксея Пысіна", прысвечаныя гісторыі вершаў выдатнага паэта-земляка. Хочацца заўважыць, што ў альманаху "Прыдняпроўе" прадстаўлены і творы маладых аўтараў — пераможцаў абласных літаратурных конкурсаў, прысвечаных 95-годдзю з дня нараджэння Канстанціна Сіманава і 50-годдзю касмічнага палёту Юрыя Гагарына. Пад агульнай рубрыкай "Маладыя галасы" надрукаваны вершы студэнтак Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова Юлі Куранковай, Яўгеніі Рудзько, выпускніцы колішняга Магілёўскага педагагічнага каледжа імя Канстанціна Ушынскага Таццяны Снігіровай, магіляўчанкі, студэнткі-завочніцы інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва горада Мінска Вольгі Куляшовай. Іх імёны ўжо вядомыя аматарам прыгожага пісьменства па публікацыях ў калектыўных зборніках. Напрыклад, студэнткі МДУ імя А.А. Куляшова друкавалі свае творы ў літаратурным выпуску універсітэцкага выдання "Натхненне", і многія нашы выкладчыкі-філолагі прыхільна ацэньваюць здольнасці і ўвогуле творчасць гэтых аўтарак. Вольга Куляшова змяшчала вершы ў калектыўным зборніку "Спасибо Вам за День Победы", які выпусціла года таму назад у свет Магілёўская абласная друкарня імя Спірыдона Собаля, а падрыхтавала да друку гэтую кніжку літаратурнае аб'яднанне Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта харчавання.

У альманаху прадстаўлены даволі цікавыя творы і іншых аўтараў нашага Прыдняпроўя. Як шчыра кажуць укладальнік гэтага выдання Уладзімір Дуктаў і адказны за выпуск Мікола Хобатаў, зрабіўшы адну справу, не спачывай на лаўрах, а хуценька бярыся за другую і зрабі яе лепш — цікавейшай і прыгажэйшай. Менавіта над гэтым зараз і засяроджана ўвага сяброў абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Рыхтуецца да публікацыі шэраг цікавых кніг, выйдзе неўзабаве і новы нумар альманаха "Прыдняпроўе".

Кніга была, ёсць і будзе найлепшым падарункам. Яшчэ больш каштоўны такі падарунак сёлета — у Год кнігі.

**Пятро КАМКОЎ,**
**старшы выкладчык кафедры журналістыкі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова.**